# З РАЗЛІКАМ НА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

## Прэзідэнт назваў перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва з Кітаем

**Навіны пра адносіны з Паднябеснай з'яўляюцца на нашым інфармацыйным полі даволі часта. Вось толькі на днях паведамлялася, што сталічныя атэлі стануць больш зручнымі для кітайскіх падарожнікаў. Ну а ўчора ў Палацы Незалежнасці кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Камітэта па кантролі і кіраванні дзяржаўнай маёмасцю пры Дзяржаўным савеце Кітайскай Народнай Рэспублікі Сяа Яцынам. Тэма размовы — канкрэтная: умацаванне дзелавых, гандлёвых, інвестыцыйных, турыстычных сувязяў паміж дзяржавамі.**

### У актыўнай фазе

Беларускі лідар удзяляе супрацоўніцтву з Кітаем асаблівую ўвагу. У многім дзякуючы яго асабістаму ўнёску нашы адносіны падняліся, здавалася б, на недасягальны — яшчэ гадоў дзесяць таму — узровень.

— Я заўсёды імкнуся знаходзіць магчымасць для сустрэчы з нашымі кітайскімі сябрамі, — прызнаўся ён.

2017 год — асаблівы для двухбаковых сувязяў, Беларусь і Кітай адзначаюць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін.

— «Жалезныя браты» і «ўсепагодная сяброўства» — гэта ёмістыя паняцці, тэрміны, што шчыльна ўвайшлі ў лексікон нашых узаемаадносін. Кітай — стратэгічны партнёр Беларусі. Аснова нашага супрацоўніцтва — сяброўства і ўзаемаразуменне, падтрымка на двухбаковых і шматбаковых пляцоўках. На апошняй сустрэчы са Старшынёй Сі Цзіньпінам сёлета ў маі мы яшчэ раз пацвердзілі статус Рэспублікі Беларусь як найважнейшага партнёра ў рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях». Сёння наступае актыўная фаза выканання нашых дамоўленасцяў. Прыклад гэтаму — ваш візіт разам з прадстаўнікамі найбуйнейшых кітайскіх карпарацый, якія з'яўляюцца гонарам і магутнасцю кітайскай эканамічнай мадэлі.

### Еўропа, Амерыка, Азія...

Падчас візіту ў Беларусь у кітайскай дэлегацыі намечаны прадметныя сустрэчы і мерапрыемствы.

— Асаблівая ўвага на іх будзе ўдзелена найважнейшаму аспекту — умацаванню эканамічных сувязяў, вызначэнню партнёраў і праектаў для рэалізацыі ў нашай краіне, — канстатаваў беларускі лідар. — Я вельмі хацеў бы, каб нашы інтэнсіўныя і высокапрасунутыя палітычныя ўзаемаадносіны стаялі на фундаменце магутных гандлёва-эканамічных адносін. Калі гэта будзе, тады ўжо наша сяброўства не парушыць ніхто.

Сапраўды, сумесныя з кітайскімі кампаніямі праекты набіраюць абароты. Яркі прыклад таму — будаўніцтва Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

— Разам з кітайскімі экспертамі, як і дамаўляліся з таварышам Сі, на тэрыторыі Парка мы стварылі адны з самых лепшых у свеце прававых умоў вядзення бізнесу, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Таму Парк становіцца міжнародным. Шырокі інтарэс да яго праяўляецца сёння з боку беларускіх, еўрапейскіх, амерыканскіх, расійскіх кампаній. Сёння гатовы ўдзельнічаць у кіраванні Паркам і прымяняць свой вопыт глабальны еўрапейскі аператар «Дуйспорт». Большасць прадстаўленых тут карпарацый — за гэтым сталом — акцыянеры і рэзідэнты Парка. Іх прыклад дэманструе на практыцы ўзаемную выгаду і патэнцыял супрацоўніцтва ў інвестыцыйнай сферы.

### Надзённае і перспектывы

Нягледзячы на дасягнутае, узаемадзеянне трэба ўзмацніць — па многіх кірунках. На некаторыя з іх Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу.

Па-першае, гэта прамое інвеставанне ў Парк, будаўніцтва новых высокатэхналагічных прадпрыемстваў — прадпрыемстваў заўтрашняга дня.

— Спадар старшыня, вы самі разумееце: калі мы пабудуем прадпрыемствы нават не ўчарашняга, а сённяшняга дня, то прадукцыю гэтых прадпрыемстваў мы не зможам рэалізаваць на рынках Еўрапейскага саюза і далей, — аргументаваў беларускі лідар. — Нам патрэбны высокатэхналагічныя прадпрыемствы, прадукцыю якіх мы б маглі прадаваць у любым кутку нашай планеты. Маштаб нашага агульнага праекта і яго велізарныя магчымасці дазваляюць разлічваць на больш важкую прысутнасць у Парку кітайскіх дзяржаўных карпарацый.

Па-другое, неабходна фарміраваць двухбаковыя праекты, займацца зліццём кампаній, спалучэннем іх патэнцыялу. Беларусь, па словах кіраўніка дзяржавы, гатова да гэтага.

Па-трэцяе, сумеснае з дзяржаўнымі карпарацыямі ўмацаванне ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва.

— Думаю, спадар старшыня, цалкам магчыма і нядрэнна было б стварэнне высокатэхналагічных прадпрыемстваў у Парку сістэмы ваенна-прамысловага комплексу. Можна сумесных, можна кітайскіх. І трэба, каб кітайскія карпарацыі ВПК прыйшлі ў гэты парк, — упэўнены Прэзідэнт.

Па-чацвёртае, развіццё турыстычнага патэнцыялу дзвюх краін.

### Наша супрацоўніцтва нікому не перашкаджае

Візіт у Беларусь чарговай высокай дэлегацыі з Паднябеснай — яшчэ адно пацвярджэнне намераў Кітая супрацоўнічаць з нашай краінай:

— Хачу асабліва падкрэсліць, што ваш візіт у Рэспубліку Беларусь з'яўляецца пацвярджэннем канкрэтных і мэтанакіраваных крокаў у сумесным развіцці і стварэнні «згуртавання адзінага лёсу» Беларусі і Кітая, — адзначыў беларускі лідар. — Упэўнены, што візіт ужо ў найбліжэйшы час прынясе істотныя вынікі. Фундамент, які мы будуем для будучых пакаленняў, будзем умацоўваць сумеснымі прадпрыемствамі, сумесным бізнесам і стварэннем неабходных умоў для прыходу Вялікага Кітая ў цэнтр Еўропы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, заўсёды выклікае насцярожанасць прасоўванне пэўнай краіны ў нейкім напрамку.

— Наша з вамі сяброўства даўняе. Яно ўзнікла тады, калі ніхто не казаў пра тое, што Кітай можа скарыстацца магчымасцямі Беларусі. Мы развіваем адносіны і зараз. Але галоўнае, што было то тады і застаецца сёння: мы не сябруем супраць некага, мы нікому не перашкаджаем. Мы развіваем наша супрацоўніцтва на прынцыпах міжнароднага права. Ні адзін дагавор Кітая і Беларусі не супярэчыць гэтым прынцыпам.

Трэба сказаць, што нягледзячы на маштабы Кітая — ва ўсіх сэнсах — гэта дзяржава не забывае пра свае пагадненні з Беларуссю:

— Вы паабяцалі нам адкрыць рынак для прадуктаў харчавання — вы яго адкрылі. І па малочнай прадукцыі, і па мясной. Вы абяцалі нам падтрымку прамысловасці — вы рэалізоўваеце свае абяцанні. Вы абяцалі падтрымаць нашу абараназдольнасць і бяспеку нашай дзяржавы — вы гэта зрабілі. Вы павінны ведаць, што мы гэтым ганарымся і будзем памятаць гэта заўсёды.

Сяа Яцын расказаў, што прадпрыемствы, якія прадстаўлены ў складзе яго дэлегацыі, уваходзяць у топ-500 буйнейшых кампаній свету. Усе яны нацэленыя на тое, каб рэалізаваць дамоўленасці, дасягнутыя паміж Беларуссю і Кітаем.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

# ЭКАНОМІКА НА ШЛЯХУ РОСТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Не выконваецца толькі адзін паказчык — па рэальна існуючых даходах насельніцтва, пры тым, што яны таксама маюць тэндэнцыю да росту. Заработная плата ў студзені—маі вырасла на 2%, і гэты рост цалкам забяспечаны ростам прадукцыйнасці працы. Варта адзначыць, што на паказчык па даходах насельніцтва ўплывае не толькі ўзровень заробкаў і пенсій, але і зніжэнне ставак па банкаўскіх дэпазітах, дзе раней фізічныя асобы «зараблялі» на высокіх стаўках, а эканоміка пры гэтым не мела прымальных па кошце рэсурсаў. Цяпер крэдытна-дэпазітны рынак балансуецца і паступова пераходзіць у нармальны стан», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Для выхаду да канца года на ўзровень сярэдняга па краіне заробку ў 1 тысячу рублёў у Мінпрацы распрацавалі графік. У чэрвені намінальная заработная плата склала 819,3 рубля, а адхіленне ад графіка складае 1%.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, рэспубліканскі бюджэт таксама выконваецца. «Прафіцыт у студзені—чэрвені склаў 1,3 млрд рублёў, або 2,7% да ВУП, і ў поўным аб'ёме накіраваны на пагашэнне валютнага доўгу краіны. Агульныя фінансавыя паказчыкі работы эканомікі паляпшаюцца. Чысты прыбытак у студзені—маі перавысіў 4 млрд рублёў з ростам да ўзроўню мінулага года ў 2,4 раза. Такая тэндэнцыя назіраецца амаль ва ўсіх галінах. Выключэннем з'яўляюцца Мінбудархітэктуры і Белкаапсаюз», — праінфармаваў прэм'ер-міністр.

### ГРОШЫ ЁСЦЬ, А АРГАНІЗАВАНАСЦІ НЯМА?

Як адзначыў Андрэй Кабякоў, дасягнуты ўзровень ВУП мог быць яшчэ вышэйшы.

«На 2017 год зацверджаны план фінансавання мерапрыемстваў дзяржпраграм у аб'ёме 1,9 млрд рублёў. Акрамя таго, за ліміты фінплана выведзена пяць інфраструктурных аб'ектаў. Гэта плюс яшчэ 464 млн рублёў ільготных рэсурсаў. За паўгода асвоена ўсяго 32,7%. Паводле разлікаў Мінэканомікі, толькі з прычыны недаасваення прадугледжаных планам рэсурсаў недабралі 0,5% ВУП. Гэта рэальная цана неарганізаванасці асобных кіраўнікоў», — упэўнены прэм'ер-міністр.

Так, на інвестпраекты ў АПК па дзяржпраграме развіцця аграрнага бізнесу было прадугледжана 369 млн рублёў. «Грошы ёсць, але для іх выкарыстання трэба, каб праекты адпавядалі патрабаванням праграм — эфектыўнасць, акупнасць, гарантыя вяртання ўкладзеных сродкаў. Гэтага пакуль няма. Мінсельгасхарч неабгрунтавана зацягнуў карэкціроўку дзяржпраграмы Аграбізнес-2020. З запланаваных 369 млн рублёў банкамі выдадзена толькі 82 млн, або 22%», — адзначыў ён.

Таксама кіраўнік урада згадаў будаўніцтва ўзлётна-пасадачнай паласы. «Прадугледжана рэсурсаў — 263 млн рублёў, выбрана 28 млн, ці 10,8%. Усе рашэнні прынятыя, рэсурсы даступныя, работа — не рухаецца. Такая ж карціна і па будаўніцтве аб'ектаў да другіх Еўрапейскіх гульняў. Ліміт — 92 млн рублёў, асваенне ўсяго 4%», — паведаміў ён.

Спіс прыкладаў можна працягваць. Прэм'ер-міністр зрабіў выснову, што ў краіне не грошай не хапае, а вельмі слабая арганізацыйна-распарадчая работа міністэрстваў, якія адказваюць за рэалізацыю гэтых праектаў. «Усе запланаваныя сродкі безумоўна павінны быць выкарыстаны. У сувязі з гэтым Мінэканомікі мной даручана аператыўна пераразмеркаваць неасвоеныя рэсурсы на іншыя аб'екты, дзе іх не хапае. Кіраўнікоў папярэджваю аб персанальнай адказнасці за эфектыўнае і поўнае асваенне крэдытных сродкаў», — рэзюмаваў Андрэй Кабякоў.

### РЭАЛЬНЫ ПРАГНОЗ

Члены ўрада таксама абмеркавалі планы па росце ВУП на 1,7% да канца года. Міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі падкрэсліў, што гэтага ўзроўню цалкам рэальна дасягнуць. «Ёсць матрыца, дзе мы павялічылі заданні, якія былі да гэтага ў некаторых міністэрстваў, у прыватнасці ў Мінбудархітэктуры, а таксама ў аблвыканкамаў. І не толькі па будаўніцтве, але і па сельскай гаспадарцы. Мы цалкам здольныя нават, магчыма, палепшыць гэты паказчык», — заявіў ён.

Паводле слоў міністра, сёння беларуская эканоміка паступальна выходзіць з рэцэсіі, якая доўжылася некалькі гадоў. «Мы зрабілі добры зачын для таго, каб усе прагнозныя паказчыкі па выніках года, а галоўны з іх — гэта ВУП, былі выкананы да 1 студзеня», — лічыць Уладзімір Зіноўскі. Ён таксама запэўніў, што рост ВУП быў забяспечаны за кошт росту прамысловай вытворчасці і транспарту. Не менш важным фактарам, на яго думку, стаў і досыць нізкі ўзровень інфляцыі. «Расце прыбытак прадпрыемстваў, эфектыўная стаўка для рэальнага сектара эканомікі цяпер 13—14%, а ў недалёкім мінулым яна даходзіла да 40%. Стаўка рэфінансавання Нацбанка знізіцца да 12%. І далейшая работа над інфляцыяй прывядзе да таго, што стаўка рэфінансавання можа быць зніжана да 7—9%», — рэзюмаваў Уладзімір Зіноўскі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Трамп вырашыў падпісаць дакумент аб санкцыях супраць Расіі

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп «на гэтым тыдні падпіша дакумент аб санкцыях у дачыненні да Расійскай Федэрацыі, гэта рашэнне неўзабаве прыме заканадаўчае аблічча і форму». Пра гэта заявіў у аўторак на прэс-канферэнцыі ў Тбілісі віцэ-прэзідэнт ЗША Майкл Пенс.

«Хачу адзначыць, што ЗША выступаюць за адмену санкцый супраць Расіі, гэта магчыма ў выпадку адмовы Расіі ад дэструктыўных дзеянняў», — адзначыў ён. Пенс сцвярджаў, што «ЗША хочуць добрых адносін і дыялогу з Расіяй». «Я і прэзідэнт Дональд Трамп упэўнены ў тым, што патрэбны больш добрыя адносіны Злучаных Штатаў з Расіяй. Думаем, што ў будучыні гэта цалкам магчыма», — дадаў ён.

### Уладальнік «Залатога мяча» 1995 года балаціруецца ў прэзідэнты Ліберыі



Былы гулец італьянскага футбольнага клуба «Мілан» Джордж Веа збіраецца балаціравацца на пасаду прэзідэнта Ліберыі. Пра гэта паведамляе шраг інфармагенцтваў.

50-гадовы спартсмен стаў адным з 20 кандыдатаў, якія будуць змагацца за найвышэйшую дзяржаўную пасаду. Сярод яго асноўных апанентаў — сенатар Прынс Джонсан і цяперашні віцэ-прэзідэнт Джозэф Баакаі. Выбары ў парламент краіны супадаюць з прэзідэнцкімі і пройдуць 17 кастрычніка гэтага года. 12 гадоў таму Веа ўжо ўдзельнічаў у выбарах прэзідэнта і заняў першае месца па выніках першага тура, аднак у другім саступіў лідарства Элен Джонсан-Серліф. Яна стала першай жанчынай-прэзідэнтам у гісторыі Афрыкі.

Джордж Веа атрымаў «Залаты мяч» (узнагарода, якая штогод уручаецца найлепшаму футбалісту свету) у перыяд гульні за «Мілан» з 1995-га па 1999 год. За зборную Ліберыі ён адыграў 60 матчаў і забіў 22 галы.

### Японец адбіўся ад мядзведзя з дапамогай прыёмаў каратэ

Жыхар Японіі, які працуе ў горадзе Фуэфукі, прэфектура Яманасі, здолеў адбіцца ад мядзведзя дзякуючы навыкам каратэ. Пра гэта паведаміў учора тэлеканал Fuji Terebi.

68-гадовы Хірахіта Міягава, які ўзначальвае мясцовую секцыю па каратэ, 31 ліпеня ўвечары выйшаў у агарод, размешчаны недалёка ад яго дома ў горнай лясістай мясцовасці, дзе вырошчваюць васабі. Там ён убачыў мядзведзя. Мужчына не разгубіўся і нанёс жывёліне, якая стаяла на задніх лапах, некалькі удараў у тэхніцы каратэ. Мядзведзь, які ніяк не чакаў такіх дзеянняў, кінуўся ўцякаць у горны лес. Фермер-каратыст сур'ёзна не пацярпеў, ён атрымаў толькі некалькі драпін, якія яму нанёс мядзведзь сваімі кіпцюрамі.

Па даных мясцовых улад, у перыяд з красавіка па жнівень у гэтым раёне было зарэгістравана па меншай меры 83 выпадкі нападу мядзведзяў на людзей.

**Установа «Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры» выказвае спачуванне загадчыку філіяла «Літаратурны музей Максіма Багдановіча» Марыне Міхайлаўне Запартыцы ў сувязі са смерцю БАЦЬКІ. Калегі падзяляюць глыбокі боль з нагоды страты роднага чалавека.**

УНП 190269032